Министерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования «Барановичский государственный университет»
Студенческое научное общество БарГУ

# СОДРУЖЕСТВО НАУК. БАРАНОВИЧИ-2016

Материалы XII Международной
научно-практической конференции
молодых исследователей

(Барановичи, 19—20 мая 2016 года)

В трёх частях

Часть 1

Барановичи
БарГУ
2016

Репозиторий БарГУ

УДК 001(082)

В часть 1 сборника материалов XII Международной научно-практической конференции молодых исследователей «Содружество наук. Барановичи-2016» включены материалы докладов по актуальным проблемам различных научных направлений: филологические науки (русский, белорусский языки); лингвистика (английский, немецкий языки); методика преподавания иностранного языка, правоведение.

Сборник адресован преподавателям и студентам учреждений высшего образования, магистрантам, аспирантам.

Редакционная коллегия:

А. В. Никишова (гл. ред.), А. В. Прадун, В. Н. Кременевская (отв. секретари),
О. Н. Фенчук, Т. М. Пучинская, А. А. Савко, Н. А. Егорова, М. В. Андрияшко

Рецензент

кандидат педагогических наук, доцент, заведующий кафедрой германских языков факультета
международных отношений Белорусского государственного университета М. Ф. Арсентьева

Репозиторий БарГУ

**ISBN 978-985-498-735-4 (ч. 1)**
**ISBN 978-985-498-734-7**

© БарГУ, 2016

УДК 811.161.3'38:82-1Гілевіч

**В. П. Шпак**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

# КОЛЕРАВЫЯ ЭПІТЭТЫ Ў МОВЕ ПАЭТЫЧНЫХ ТВОРАЎ НІЛА ГІЛЕВІЧА

**Уводзіны.** Колер мае вялікае значэнне ў жыцці чалавека. Ён адыгрывае важную ролю ў розных галінах дзейнасці. Людзі, каб выглядаць прыгожа, стараюцца падабраць сабе, напрыклад, адзенне пэўнага колеру; дызайнеры, каб паказаць утульнасць прадмета, пакоя, гарманічна спалучаюць колеры і іх адценні; мастакі, адлюстроўваючы таямнічую чароўнасць прыроды, выкарыстоўваюць разнастайную колеравую гаму.

Псіхолагі лічаць, што кожны колер мае сімвалічнае значэнне: жоўты сімвалізуе багацце, справядлівасць, вернасць і сталасць; белы — нявіннасць і чысціню; чырвоны — мужнасць і адвагу; сіні — прыгажосць і веліч; зялёны — багацце, надзею і жыццё; чорны — мудрасць, сціпласць, агрэсію і смутак [1, с. 145]. Значэнне колераў у паэтычных творах даследуецца лінгвістамі ва ўзаемасувязі з такім мастацкім прыёмам, як эпітэт.

**Асноўная частка.** У творах народнага паэта Беларусі Н. Гілевіча ў якасці колеравых эпітэтаў ужываюцца прыметнікі, якія, спалучаючыся з назоўнікамі, набываюць новыя сэнсавыя значэнні, гэта значыць метафарызуюцца.

Найбольш ужывальнымі з іх з’яўляюцца прыметнік *белы* і ўтвораныя ад яго лексемы *бялёсы, бялюткі, белапенны*, а таксама рэдуплікат *белы-белы.* Часта яны выкарыстоўваюцца пры апісанні прыроды, каб паказаць яе маляўнічасць: *Высока ў небе воблачка плыве, // Плыве **бялюткае** адно ў блакіце* [2, с. 10]; *...У сутонні абрыва, // Пад масткамі, што суха рыпяць, // **Белапенныя** грывы над ілбамі каменняў ляцяць* [3, с. 53].

На фоне прыроднай нявіннасці і чысціні, пазначаных прыметнікамі з коранем *бел- (бял-)*, зараджаюцца або мацнеюць пачуцці кахання: *І двор, і кветнік, і бярозы **белыя** — // Усё заціхла ў пераспелых росах, // Калі ля вясніц, ціхая, нясмелая, // Руку мне Зося падала на ростань* [4]; *Жнівень. // Арэхі. // І жоўтыя восы, // Што заміналі цябе цалаваць. // Першы маток павуціны **бялёсы**. // Пах пераспелай травы ў галавах* [5].

Сімвалам светлай дабрыні, упэўненасці і шчасця выступае прыметнік *белы* ў наступных паэтычных радках: *І сыпяцца* [*дні*] *патроху // З маіх галін-гадоў // На **белую** дарогу, // На ўсланы снегам дол* [6]; *Над **белым** светам сумавала танга. // І зноў і зноў у песеньцы старой // Мне чуўся сон апошняга расстання — // Ды не чыйгосьці, а майго з табой* [7]; *І зноўку вера ў слова матчына / Свяціла мне, як **белы** дзень* [8]; *Каб мог я, таварыш, каб толькі я мог // Прайсці да цябе праз няволі парог — // На **белых** галінках табе б я прынёс //Чароўную казку зімовых бяроз, // Міксіс Тэадаракіс* [9].

Сімвалічнае значэнне маюць таксама назоўнікавыя словалучэнні з прыметнікам *белы* ў іх складзе: *белая чайка* — сімвал творчасці пісьменніцкага таленту; *белая кладка* — сімвал чысціні, нявіннасці; *белыя пальчаткі* — сімвал бяздзейнасці: *Мне здалося на момант: // Чайку **белую** // Раптам ўбачыў я, // Што да ўцёса ляціць // Над агромністым // Морам любові, // І адчуў, // Як на сэрцы мне // Пырснулі пыркі гарачыя, // Калі зала грымела // Магутным раскатам // Прыбою* [10]; *І без мяне да берага пайшла. // На **белай кладцы** мокрыя слядкі — // Як першай песні мілыя радкі* [11]; *Ёсць вера ў Пачатак // І вера ў здзяйсненне. // Без **белых пальчатак** // Нам служыць натхненне* [12].

Па-мастацку выкарыстоўвае Н. Гілевіч лексічныя магчымасці прыметнікаў *залаты* і *залацісты*, якія служаць стварэнню зрокавага вобраза, сімвалізуюць сабой пачуцці захаплення, замілавання, любові: *Замірае, // Сціхае // Мая **залатая** дуброва, //Аасыпае, // Скідае на дол // Свой задумлівы ўбор* [13]; *Беларусы! // Ды не верце ж вы // Новаяўленым ілжэпрарокам: // Умярцвяць яны наш дух жывы — // І давер наш вылезе нам бокам! // **Залатое** пасвячы цяля // На лугах цяністага падполля* [14]; *Больш не горка гасцям. // Горка мне аднаму! // Толькі мёду мне ў чарку не ліце. // За жыты **залатыя** свой тост я ўзніму // Ды за песню, што згублена ў жыце* [15]; *І возьме* [*дзяўчына*] *самы ўдалы, **залацісты**, // Крамянабокі, вымыты ў расе, // Патрэ ў далонях (яблык, як навошчаны, // Аж заскрыпіць) і, з марамі дзявочымі, // На сонца гляне праз яго: свіціцца!* [16]; *І не знаеш, як горача, як апантана шапчу я: // «Спі, мая лугавая, мая **залатая** мядуначка»* [17].

Зялёны колер — сімвал надзеі і багацця, вечнага жыцця. Менавіта такім ён і ўспрымаецца: *А ўсё кронай **зялёнай** // Лічыць мох на кары // І не чуе натхнёнай // Песні дрэў угары* [18]; *Не гаманіце, вербы, не будзіце, // Не грайце, ветры, у **зялёным** веццi: // Яна ўсю ноч над дзіцем // І задрамала толькі на дасвецці* [19]. Багатым эмацыянальным зместам насычаны словазлучэнні, якія маюць цэласны сэнс, выступаючы ў якасці перыфразы: *зялёны палац* ‘лес’, *зялёная грамада* ‘дрэвы’. У іх — выражэнне пачуццяў павагі і любові да прыроды роднага краю: *Дзе ж ты дзелася, пушча? // У **палац** твой **зялёны** // І спякотай і сцюжай я прыносіў паклоны* [20]; *Лес ачнуўся, лес вялікадня святкуе — // Вунь як весела ў **зялёнай грамадзе**! // Толькі дуб адзін вясны як бы й не чуе — // Нават леташнім лістом не павядзе* [21].

Чырвоны колер выяўляецца ў прыметніках *чырвоны, вішнёва-алы, барвовы.* Эпітэт са значэннем ‘чырвоны’ — гэта знак смерці, барацьбы, перамогі. Ён дапамагае праўдзіва апісаць крывавыя падзеі мінулай вайны, нялёгкую перамогу над ворагам, барацьбу за праўду: ***Чырвоны** снег пад ногі // Не кідайце далоў! // Глядзіце: ён дарогу // Зафарбаваў у кроў* [22]; *А снег — **вішнёва-алы** // Ад бацькавай крыві. // І так мне страшна стала — // Хоць нема зараві* [23]; *Толькі ў хату ранічкай // Уварваўся немец — // Вырваў з рук у Манечкі // Каснічок **чырвоны*** [24]; *Ад продкаў нам застаўся гэты колер, // А для змагання мы сябе ўзялі // **Чырвоны** колер праўды і ніколі // Не ўступім*

© Шпак В. П., 2016



Репозиторий БарГУ

*з ім няпраўдзе на зямлі* [25]; *І песня ў невадзе яго* [*песняра*] *звінела, // І вырвалася ў бязмеж-прасцяг // І перад ёю далячынь яснела, І ўсход* ***барвовы*** *палымнеў, як сцяг* [26].

Прыметнік *сіні* ўзмацняе колеравае адценне некаторых паняццяў, выступае звяном у тэме любові да прыроды. Ён, напрыклад, дапамагае чытачу або ўявіць пышны каляровы букет кветак, або ўбачыць неба ясным, бязвоблачным, ці паказаць замілаванасць сваім родным краем: *Раптам бачу: між кустоў дзяўчынка. // З* ***ярка-сінім*** *факелам шалфею, // Крочыць ціха вохкаю сцяжынкай, // Як мальнькая лясная фея* [27]. *А росы колкія — аж бегчы хочацца, // А неба* ***сіняе — аж перасінена*** [28]. *На досвітку* ***сінім*** *ярчэе мароз // І свеціцца іней на голлі бяроз* [29]. *Адзін ты знаеш, дружа мой маўклівы, // Які быў я ў цябе ў гасцях шчаслівы, // Мой* ***сіні*** *бор, мой родны бор зялёны!* [30]. Сімвалічнае значэнне гэты эпітэт набывае ў словазлучэнні *Сіняя пушча* 'спадчына продкаў': *Ганарыўся па праву // Продак пушчаю* ***Сіняй****. // Як жа мог ты пазбавіць // Гэтай гордасці сына?* [31].

Прыметнік *чорны* выкарыстоўваецца паэтам як у прамым сэнсе, паказваючы на колер, так і ў пераносным, набываючы метафарычны сэнс: *Мурашкі* ***чорныя****, ажыўшы на прыгрэве, // Ужо спраўляць памінкі напаўзлі* [32]; *І чую я голас, падобны // На голас матулі маёй: // «Будзь дужы, будзь мужны і добры, // Не бойся натхнёных хлуснёй. // Адрынь іх суды-перасуды. І* ***чорнай*** *не вер варажбе»* [33].

У беларускім фальклоры *чорны* — сімвал няшчасця. У вершаваных радках Н. Гілевіча ён асацыюецца з сумам, гневам, брудам, смерцю, нярэдка выкарыстоўваючыся ў складзе індывідуальна-аўтарскіх перыфраз: *чорны шар* 'смерць', *чорнае цеста* 'някасная ежа', *чорны твар* 'сведчанне пакут'; *чорны сум* 'жах', *чорныя нівы* 'адсутнасць жыцця', *чорны гнеў* 'абурэнне'; *чорны бруд* 'плёткі, няпраўда'. Калі аб'яднаць гэтыя з'явы ў адзіную карціну, то будзе вымалёўвацца жудасны воблік падзей мінулага стагоддзя*: Пакаціўся долу //* ***Чорны шар*** *з гары — // За пагоркі ў полі, дзе аўсы жаўцелі* [34]; *Дома, счысціўшы шалупінне, / Сыплю бульбу ў старую ступу // І таўку таўкачом вялізным //* ***Цеста чорнае****, як зямля* [35]; *Відаць, за* ***чорны*** *даўганосы* ***твар*** *// Разваліў гэтак на сяле жанчыну. // Яна жыла ўдовою — з хворай маці // І чатырма дзяцьмі, яшчэ малымі* [36]; *Не стала Рудні і Кандратавіч, // Датла скіпела Гарадзішча — // І плакаць некаму над стратамі, // Над* ***чорным сумам*** *папяліпічаў* [37]; *Прыдумайце што-небудзь, чорт вазьмі, // Каб дождж пасыпаўся на* ***нівы чорныя****, // Каб не сыходзіла душа слязьмі* [38]; *Улоў ягоны — гнеў твой трапяткі, // То* ***чорны гнеў****, што ўздыбліваў глыбіні* [39]; *Нас могуць //* ***чорным брудам*** *паліваць, // Культываваць бяспамяцтва, бяспраўе* [40].

Найбольшая сэнсавая выразнасць ужывання прыметніка *чорны* дасягаецца паэтам у «Баладзе ў чорным», дзе праз анафарычны яго паўтор ствараецца вобраз усеагульнага жаху і гора: *На бязмоўных вуліцах цемень залягла. //* ***Чорны*** *цень сутуліцца — сочыць з-за вугла. // Цокаюць падкоўкамі боты аб асфальт. //* ***Чорныя*** *палкоўнікі чыняць* ***чорны*** *гвалт. //* ***Чорныя*** *іх постаці —* ***чорныя*** *суды. //* ***Чорныя*** *апосталы гора і бяды!* [41].

У паэзіі Н. Гілевіча прыметнік *срэбраны* выступае як колеравы эпітэт, дапамагаючы намаляваць казачнасць прыроды, яе загадкавасць: *І ў мутных хмарках месячык мільгае, // Як паміж ніцяў* ***срэбраны*** *чаўнок* [42]; *І ўсё ж нейкую нітачку дзесь зачапіла: // Скалыхнулася голка — пыл* ***срэбны*** *курыць* [43]; *Па* ***срэбнай*** *дарожцы, што бляскамі грае, // Русалка на бераг выходзіць з вады* [44]; *І ныраў у хвалях месяц белы, // Неспайманай* ***серабрыстай*** *рыбінаю* [45].

Не страчваюць свайго эмацыянальна-ацэначнага значэння ў паэтычных словах Н. Гілевіча прыметнікі *жоўты, жаўтлявы, блакітны, шызы, шэры: Пагорачкі родныя ў* ***шызай*** *смузе. // За насыпам —* ***жоўты*** *бярозавы пояс* [46]; *Зноў на ўзлеску цвітуць-дацвітаюць арэшыны — // У* ***жаўтлявых*** *падвесках каткоў-завушніц* [47]; *Перад* ***блакітным*** *алтаром тваім // трымаю споведзь і прашу прабачыць, // Што я наважыў одумам сваім // У гэтых звонкіх хвалях парыбачыць* [48]; *Няхай чыстаплюі, // Жыцця пустаглумы // Глытаюць пілюлі ад* ***шэрага*** *суму* [49].

**Заключэнне.** У паэтычных творах Н. Гілевіча ўжываюцца колеравыя эпітэты *белы, бялёсы, бялюткі, белапенны*, *белы-белы, залаты, залацісты, зялёны, сіні, ярка-сіні, сінякрылы, чырвоны, вішнёва-алы, барвовы, жоўты, жаўтлявы, чорны, срэбраны, серабрысты.* Яны выконваюць эстэтычную і эмацыянальную функцыі, з'яўляюцца дзейсным сродкам стварэння мастацкага вобраза. Іх выкарыстанне дазволіла паэту паказаць непаўторнасць навакольнага свету, адлюстраваць праўдзівасць апісаных падзей і з'яў, выклікаць патрыятычныя пачуцці ў чытача.

**Спіс цытуемых крыніц**


1. Лебедев-Любимов А. Н. Психология рекламы. М. : Наука, 2002. 292 с.
2. Гілевіч Н. Выбраныя творы : у 2 т. Мінск : Маст. літ., 1991—478. Т. 1. Вершы, паэмы, п'есы.
3. Гілевіч Н. Выбраныя творы ; уклад. і камент. Н. Гілевіча ; прадм. У. Конана. Мінск : Кнігазбор, 2009. 600 с.
4. Гілевіч Н. Выбраныя творы : у 2 т. Т. 1. Вершы, паэмы, п'есы. С. 179.
5. Гілевіч Н. Выбраныя творы. С. 48.
6. Гілевіч Н. Выбраныя творы : у 2 т. Т. 1. Вершы, паэмы, п'есы. С. 99.
7. Там жа. С. 192.
8. Там жа. С. 200.
9. Там жа. С. 144.
10. Там жа. С. 120.
11. Там жа. С. 191.
12. Там жа. С. 230.
13. Гілевіч Н. Выбраныя творы. С. 53.
14. Там жа. С. 112.
15. Гілевіч Н. Выбраныя творы : у 2 т. Т. 1. Вершы, паэмы, п'есы. С. 11.
16. Там жа. С. 39.
17. Там жа. С. 181.
18. Там жа. С. 148.




Репозиторий БарГУ

19. Там жа. С. 51.
20. Там жа. С. 28.
21. Там жа. С. 183.
22. Там жа. С. 68.
23. Там жа. С. 67.
24. Там жа. С. 109.
25. Там жа. С. 93.
26. Там жа. С. 91.
27. Там жа. С. 50.
28. Гілевіч Н. Выбраныя творы. С. 74.
29. Гілевіч Н. Выбраныя творы : у 2 т. Т. 1. Вершы, паэмы, п'есы. С. 11.
30. Там жа. С. 37.
31. Там жа. С. 29.
32. Гілевіч Н. Выбраныя творы. С. 75.
33. Там жа. С. 95.
34. Гілевіч Н. Выбраныя творы : у 2 т. Т. 1. Вершы, паэмы, п'есы. С. 108.
35. Там жа. С. 81.
36. Там жа. С. 62.
37. Там жа. С. 106.
38. Там жа. С. 205.
39. Там жа. С. 89.
40. Там жа. С. 267.
41. Там жа. С. 145.
42. Гілевіч Н. Выбраныя творы. С. 64.
43. Там жа.
44. Гілевіч Н. Выбраныя творы : у 2 т. Т. 1. Вершы, паэмы, п'есы. С. 185.
45. Там жа. С. 133.
46. Гілевіч Н. Выбраныя творы. С. 59.
47. Там жа. С. 89.
48. Гілевіч Н. Выбраныя творы : у 2 т. Т. 1. Вершы, паэмы, п'есы. С. 94.
49. Там жа. С. 231.

УДК 37.016:81–028.31

**В. П. Шпак, Н. В. Ермалович**
*Учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи*

## РАЗВИТИЕ РЕЧИ МЛАДШИХ ШКОЛЬНИКОВ НА СИНТАКСИЧЕСКОМ УРОВНЕ

**Введение.** Хорошо развитая речь служит одним из важнейших средств активной деятельности человека в современном обществе, а для школьника — средством успешного обучения в школе. Речь — основа всякой умственной деятельности, средство коммуникации. Умения учеников сравнивать, классифицировать, систематизировать, обобщать формируются в процессе овладения знаниями через речь и проявляются также в речевой действительности. Логически чёткая, доказательная, образная речь ученика — показатель его умственного развития. В связи с актуальностью данной проблемы в основу преподавания начальных курсов русского языка и литературного чтения положено всестороннее развитие речи. Этой задаче подчинено изучение всех разделов науки о языке.

Особую роль в развитии речи играет синтаксис. Осознание таких синтаксических единиц, как словосочетание и предложение, позволяет с функциональной точки зрения оценить все средства языка и речи, изученные в разделах фонетики, лексики, фразеологии, морфологии.

Работа над словосочетанием предполагает осмысление словосочетания как особой единицы языка, которая служит для образования предложений. Научить младших школьников сознательно пользоваться предложением — значит развить умение делить поток речи на законченные структурно-смысловые единицы, вычленять предмет мысли, структурно и интонационно оформлять мысль, соединяя слова в предложения.

В работе над предложением в начальных классах условно выделяют пять основных направлений: 1) формирование грамматического понятия «предложение»; 2) изучение структуры предложения (работа над пониманием сущности связи слов в словосочетаниях, осознание грамматической основы предложения, особенностей главных и второстепенных членов, прямого и обратного порядка слов, распространённых и нераспространённых предложений); 3) формирование умения пользоваться в своей речи предложениями, равными по цели высказывания и по интонации; овладение правильным интонированием предложения; 4) развитие умения точно употреблять слова в предложениях; 5) формирование умения оформлять предложения в письменной речи (употребление прописной буквы в начале предложения, постановка знаков препинания) [1, с. 276].

Таким образом, словосочетание и предложение — это опора развития синтаксического строя учащихся. Этим синтаксическим единицам отводится большая роль при моделировании уроков русского языка и литератур-

© Шпак В. П., Ермалович Н. В., 2016



Репозиторий БарГУ